Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт
імя Максіма Танка

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ: НОВАЕ Ў ДАСЛЕДАВАННІ І ВЫКЛАДАННІ

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі*

**27 сакавіка 1999 года**

**Частка 1**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Мінск 1999**

На самой справе зямлі закладвалася значна больш. У статданых даецца толькі тая колькасць, якая засталася ў распараджэнні банка ў якасці залогу на момант справаздачы. Тыя ж землі, якія прадаваліся банкам за нявыплату працэнтаў альбо якія выкупляліся пазыкаатрымальнікам, не знаходзілі свайго адлюстравання. Так, з 1897 да 1914 г. уключна банк прыняў пад залог 2392 тыс. дзес. і выдаў пазык на суму 74479 тыс. руб. [4].

Разам з тым дваране на рукі атрымалі толькі частку грошай, якія налічваліся за закладзеныя землі. Так, на 1 студзеня 1897 г. пазычальнікам належала атрымаць 7417 тыс. руб. Але з гэтай сумы банкам было вылічана 5861 тыс. руб. для разлікаў з іншымі крэдытнымі ўстановамі, дзе папярэдне дваранамі былі атрыманы пазыкі. Такім чынам, толькі 1557 тыс. руб., ці 21,0%, было выдадзена пазычальнікам [5]. Гэтыя дадзеныя сведчаць аб тым, што закладваліся ў асноўным маенткі, якія ўжо былі закладзены ў іншых крэдытных установах. Хаця сельская гаспадарка ў рынкавых умовах не можа існаваць без крэдытаў, аднак Дваранскі банк хутчэй імкнуўся ўратаваць дваранскае землеўладанне ад пераходу яго да іншых саслоўяў, чым фінансаваў сельскагаспадарчую вытворчасць.

Акрамя гэтага, банк адстойваў інтарэсы сярэдняга і буйнога дваранскага землеўладання. Па статуту банк мог браць у заклад такую колькасць зямлі, пазыка з якой павінна складаць не менш 1 тыс. руб., г.зн. што кошт закладзенага маентка не мог быць менш чым 2 тыс. руб.

Аб тым, што кліентамі банка былі буйныя латыфундысты, сведчыць і сярэдні памер закладзенай зямлі. У канцы XIX ст. ен складаў 1734,2 дзес. З паступовым драбленнем латыфундый, а таксама з тым, што неабавязкова ўся зямельная плошча закладвалася і з павышэннем кошту зямлі, сярэдні памер закладзеных маемасцяў памяншаўся. На 1 студзеня 1904 г. ен склаў 1280,7 дзес., а на 1 студзеня 1915 г. — 1003,3 дзес. Асабліва буйныя латыфундыі закладваліся ў Мінскай губ., сярэдні памер якіх пераўзыходзіў паказчык для 5 заходніх губерняў у 2,7 раза [6].

Першапачаткова паслугамі банка карысталіся выключна патомныя дваране. Праз 10 гадоў яго дзейнасці толькі 0,5% закладзенай зямлі прыпадала на асоб не з вышэйшага саслоўя. Да 1914 г. іх доля павысілася да 1/3. Гэта былі прадстаўнікі ўсіх іншых саслоўяў, акрамя сялян. Пры продажу дваранамі закладзеных у банку маенткаў іх даўгі пераводзіліся на новых уладальнікаў [7]. Такім чынам, банк, які ствараўся з мэтай падтрымкі землеўладання патомных дваран, паступова ператвараўся ў бессаслоўны. Земля як аб'ект куплі-продажу не ўпісвалася ў саслоўныя межы. Яна пераходзіла ў рукі тых, хто быў больш прадпрымальны, эканамічна моцны.



### Літаратура


1. Анфимов А. М. Крупное помещичье хозяйство Европейской России. М., 1980. С. 318.
2. Отчет Государственного дворянского земельного банка за 1897 г. СПб., 1899. Приложение. С. 6—11.
3. Отчет Государственного дворянского земельного банка за 1914 г. СПб., 1915. С. 4—7.
4. Отчеты Государственного дворянского земельного банка за 1897—1914 г.
5. Отчет Государственного дворянского земельного банка за 1897 г. СПб., 1899. Приложение. С. 235.
6. Отчеты Государственного дворянского земельного банка за 1897, 1903, 1914 г.
7. Отчеты Государственного дворянского земельного банка за 1896, 1914 г.


М. М. Забаўскі

## ГАЗЕТА «ОКРАИНЫ РОССИИ» — ПРАВАДНІК УРАДАВАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯХ (1906—1912 гг.)

Ціск рэвалюцыйна настроеных мас, чаканне буржуазных рэформ з боку ліберальнай апазіцыі прымусілі Мікалая II 6 жніўня 1905 г. заснаваць Дзяржаўную думу для папярэдняй распрацоўкі і абмеркавання заканадаўчых прапаноў, якія затым праз Дзяржаўны Савет накіроўваліся ... Адпаведна выбарчаму закону і ўказу ад 11 снежня ў краіне павінны былі адбыцца шматступенчатыя выбары, у ходзе якіх кожная курыя (г.зн. група выбаршчыкаў, аб'яднаных формай уласнасці ці прыналежнасцю да пэўнага саслоўя) павінна была абіраць сваіх уласных прадстаўнікоў, агульны сход якіх у кожнай губерні абіраў бы затым дэпутатаў у Думу. ... якім фарміраваліся курыі, забяспечваў большае прадстаўніцтва ... землеўласнікаў».

У красавіку 1906 г. пачаліся выбары ў I Дзяржаўную думу Расіі. Яны выклікалі шырокі грамадскі рух. Разгарнулася вострая барацьба розных грамадскіх і палітычных сіл па пытанню аб адносінах да яе. Гэта было першае адкрытае выступленне на палітычнай арэне створаных у ходзе рэвалюцыі партый і груп.

... ўрадавага лагера на выбарах абаранялі памешчыцка-... чарнасоценныя партыі. Найбольшага паспеху іх агітацыя ... ў рэгіёнах са шматнацыянальным складам насельніцтва, да якіх



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

адносіліся і заходнія (беларускія) губерні. Галоўным аб'ектам нападкаў станавіліся «польскія» землеўладальнікі і яўрэі. Ролю агітатара і арганізатара «истинно-русских» людзей у краі ўзяла на сябе газета «Окраины России». Яе рэдактарам з'яўляўся беларус па паходжанню П. Р. Бывалькевіч, а выдаўцом П.́ А. Кулакоўскі. Сярод заснавальнікаў вялікадзяржаўна-шавіністычнага выдання былі прадстаўнікі духавенства, рускай арыстакратыі, некалькі прафесараў, грамадскіх дзеячаў, публіцыстаў, купцоў і інш. У рэдакцыю «Окраины России» уваходзілі Н. А. Звераў, В. Ф. Дзейтрых, М. М. Бародкін, А. М. Карнілоўскі, князь А. А. Шырынскі-Шахматаў, Б. М. Якунчыкаў і інш. Першы нумар выйшаў 6 сакавіка 1906 г. «У гэты час, — адзначалі "Окраины России", — палякі ўжо падрыхтавалі праект свае аўтаноміі і ўзнікла пагроза адзінству імперыі». З гэтага дня і на працягу сямі гадоў газета вяла раз'юшаную шавіністычную агітацыю, накіраваную супраць палякаў і каталіцкага касцела, супраць беларускага нацыянальнага руху [1]. Нападкі на яўрэяў, а таксама супраць беларускага нацыянальнага руху [1]. Нападкі на палякаў у рэшце рэшт выліваліся супраць газеты «Наша ніва», якая «прапаведвала пад дыктоўку палякаў, на асобным жаргоне, беларускі сепаратызм» [2] — імкненне да аддзялення Беларусі ад Расійскай імперыі.

У сваей знешнепалітычнай дзейнасці цалкам на газету «Окраины России» арыентаваўся часопіс расійска-шавіністычнага накірунку «Крестьянин». Сумесна з нумара ў нумар яны сцвярджалі, што Заходні край «спакон руская зямля, і яго насельніцтва — арганічная частка і галіна адзінага рускага народа». Галоўнай задачай у выдавецкай дзейнасці П. Р. Бывалькевіча і яго «паплечнікаў» было дамагацца поўнага зліцця Беларусі і Вялікарасіі на глебе адзінства нацыі і культуры» [3].

22—23 снежня 1912 г. выйшаў апошні нумар «Окраины России». Аб яе гістарычнай місіі для «рускага» насельніцтва заходніх губерняў у нумары разважалі галоўны рэдактар і выдавец. Яны нагадвалі, што першы нумар выйшаў у той час, калі Расія прыступіла да выбараў у I Думу, калі існавала верагоднасць страты ўскраін. На думку заснавальнікаў газеты, менавіта дзякуючы дзейнасці такіх выданняў, як «Окраины России», улады ўсе «глыбей пранікаліся патрэбамі ўскраін і прымалі меры для абароны правоў «рускага народа — «гаспадара на ўскраінах Рускай дзяржавы». «Часы змяніліся, — адзначалася ў «Окраины России», — ускраінныя пытанні сталі цэнтральнымі ў дзейнасці ўсіх палітычных лагераў у Думе і па-за Думай. Нацыянальныя праблемамі ускраін цікавіцца друк розных палітычных напрамкаў і істотная патрэба ў такой газеце, як «Окраины России», больш не існуе».

Другімі словамі, «истинно-русские», аб'яднаныя вакол «Окраин России», прыйшлі да высновы, што стварэнне асобных «рускіх» курый



падзелы на нацыянальныя аддзяленні ў час выбараў у III і IV Думы і земствы, а таксама шырокая фінансавая падтрымка правых выданняў і забарона апазіцыйных і іншыя захады ўраду, накіраваныя ў заходніх губернях супраць палякаў і яўрэяў, супраць беларускага нацыянальнага руху і газеты «Наша ніва», не дадуць тут загінуць «рускай справе». А калі зноў з'явіцца неабходнасць у друкаваным рускім органе, «Окраины России» раскрыюць свае старонкі «жадаючым весці барацьбу з сепаратызмам ускраін і стаяць за адзіную, непадзельную, святую Русь» [4].

**Літаратура**

1. Окраины России. 1912. 22—29 дек.
2. Тамсама. 3 нояб., 1 дек.
3. РДГА. Ф. 909. Воп. 1. Спр. 201. Арт. 1—5.
4. Окраины России. 1912. 22—29 дек.

**В. К. Заремский**

## ИЗМЕНЕНИЯ В СОСТАВЕ, ЧИСЛЕННОСТИ И ПОЛОЖЕНИИ РАБОТНИКОВ УЧРЕЖДЕНИЙ СВЯЗИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX—XX в.

Быстрое развитие научно-технических знаний с середины XIX в. отвечало растущим потребностям буржуазного общества. Этот процесс не обходил стороной и белорусские земли. Развитие почтовых сообщений вступило в этот период в новую фазу. Появляются телеграф, телефон, радио, которые изменили коренным образом общение между людьми.

Если в первой половине XIX в. почтовые сообщения основывались на конных почтовых перевозках почтовых грузов и пассажиров, то с постройкой железных дорог их начинают перевозить этим видом транспорта. Первоначально владельцы дорог сами устанавливали порядок перевозки почт, но с 1890 г. было создано Управление VI отдела перевозки почт по [illegible] (г. Минск), которое отвечало за организацию и решение этих вопросов в Беларуси. Почта перевозилась в специальных почтовых вагонах. Поезда № 41/42 Москва — Брест, № 191/192 С.-Петербург — Жлобин и др.

Быстро развивался телеграф. Первоначально через Беларусь прошли лишь транзитные линии, на которых устраивались только подстанции. В 1859 г. под руководством инженер-подполковника Алымова была создана телеграфная линия от Ковно через Вилькомир, Вильно, Минск и Бобруйск в Могилев и от [illegible] через Полоцк, Витебск в Смоленск с ответвлением через Могилев в [illegible]. Это связало почти все районы Беларуси телеграфом и привело к



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ